

# Ларыса ВЫРКО

Ларыса Фёдараўна Вырко (Буранкова) нарадзілася 11 кастрычніка 1954 г. у в. Дзяляцічы Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. Дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі на Магілёўшчыне. Пасля заканчэння Брацькавіцкай сярэдняй школы Касцюковіцкага раёна паступіла ў Беларускі тэхналагічны інстытут імя С. М. Кірава і закончыла яго ў 1977 г. Працавала інжынерам-тэхнолагам і галоўным інжынерам на ОАО «Столінская фабрыка кухоннай мэблі». Жыве ў г. Століне Брэсцкай вобласці. З'яўляецца кіраўніком літаратурнай гасцёўні ў цэнтры сацыяльнага абслугоўвання грамадзян пажылога ўзросту.

Вершы і празаічныя творы Ларысы Вырко друкаваліся ў раённых, абласных і рэспубліканскіх перыядычных выданнях. Крытычныя артыкулы аб творчасці паэтэсы змяшчаліся на старонках газеты «Літаратура і мастацтва», а таксама ўвайшлі ў кнігу Міколы Леўчанкі «Вяртанне».

Творы друкаваліся ў рэспубліканскім часопісе «Алеся», літаратурна-мастацкім часопісе «Метамарфозы».

Ларыса Вырко з'яўляецца аўтарам кніг паэзіі і ўкладальнікам зборнікаў фальклорных песень: «Там, дзе зоры глядзяцца ў Гарынь», Мінск, «Кнігазбор", 2009 г., «Тут мае карані», Мінск, «Кнігазбор», 2010 г., «Фальклорныя песні Століншчыны», Пінск, «Пінская рэгіянальная друкарня», 2012 г., «Фальклорныя песні Прыбясеедскага краю», Мінск, «Кнігазбор», 2014 г., «Гронкі рабіны», Мінск, «Кнігазбор», 2020 г. Вершы Ларысы Вырко ўвайшлі ў калектыўны зборнік паэзіі «Беларускі ручнік", Мінск, выдавецкі дом «Звязда» 2013 г.

**Санет**

На снежным палатне іскрацца зоры,
Начны свяцільнік месяц запаліў.
На дрэвах белыя карункавыя ўборы,
Дарогі, сцежкі снег зацерушыў.
Ўжо поўнач, а ў акне не гасне свет,
Там зачарованы красою верша,
Чытае кнігу будучы паэт,
І ў яго радок кладзецца першы.

А той узор, што на акне іскрыцца,
У снах яму не раз прысніцца
І доўга будзе зоркамі гарэць.

Бруіцца чыстая паэзіі крыніца,
Яна дае святой вады напіцца
Заўсёды, каб душою не чарствець.

**Санет**

Даўно лісты дуброва абтрусіла
І вось ужо ў лесе, ў полі – снег.
Там рэчка сцішыла свой бег,
І чысціня ўвесь свет запаланіла.

Куды не глянь – блакітныя снягі.
Здаецца і жыццё на час застыла.
Ды шкло ільда раку не супыніла,
Марозам лютым скуты берагі.

Да роднае ракі далёка плыць,
Але і праз гады мне не забыць:
Купальскія вянкі рака сплаўляла.

Імчыцца час – яго няспынна плынь,
Душой і сэрцам толькі не астынь
Да той зямлі, цябе што ўзгадавала!

**Санет**

Калі убачу ўскрай дарогі ў полі
Рамонкі або вочы васількоў,
Дзяцінства ўспамінаецца міжволі
І чысты позірк сінявокіх хлапчукоў.

Ды праз гады народ іх не забудзе,
Сваіх сыноў, што край свой збераглі.
“Героі не ўміраюць” – кажуць людзі,
Бо нават смерць яны перамаглі.

Якаў Палачанін мужна йшоў у бой,
Васіль Вашчыла вёў сялян з сабой.
За праўду і свабоду – паміралі.

Не рушце сініх кветак васількоў!
Яны жывыя вочы хлапчукоў,
Што за свой край жыцця не шкадавалі.

**Санет**

Яны ляцяць у цёплыя краіны,
Як восень ліст апошні абтрасае,
І клін высока ў небе жураўліны
Надоўга родныя валокі пакідае.

Халоднае ўжо чуецца дыханне,
Як восень адыходзіць нацянькі.
Курлы-курлы – чуваць на развітанне
Чакаюць іх пагодныя дзянькі.

Шчаслíва ў шлях! І я б жадала крылы,
Каб птушкай паляцець за небакрай
Пабачыць той далёкі, цёплы край.

Але ж свой кут для сэрца мілы.
І прыгажэй няма сваіх азёр, бяроз,
І тых мясцін, што сэрцам ты прырос.

**Вясновы сад**

Ты помніш сад у веснавым убранні?
Сярод духмяных і цвітучых дрэў
Стаялі мы, а вецер усё шумеў.
Свяцілі зоркі з вышыні да рання.
Мне аб каханні гаварылі твае вочы.
Я не паверыла, бо не чакала
І у адказ нічога не сказала.
Цвітучы сад скідаў пялёсткі ў ночы.

А мы стаялі паміж белых дрэў
І хмарка частку месяца хавала.
Ты аб каханні мне сказаць хацеў,
Маю далонь ў сваёй руцэ сагрэў,
Што мне казаць – я проста не чакала,
Таму, прабач, нічога не сказала…

**Санет**

У лесе не чуваць птушыны грай,
Тут Восень ходзіць ў залатым уборы.
Замоўклі, сціхлі веснавыя хоры
І птушкі адляцелі ў цёплы край.

Нязломны дуб яшчэ шуміць лістом,
Ды пільна узіраецца ў нябёсы.
З цяжкіх галін страсае вецер босы
Нібы каралі – жалуды на дол.

Карэнне моцнае трымае глеба,
Ён шапкай-кронай цягнецца да неба.
Растуць асілкі новыя пад ім.
Іх сокі пояць, сонца ў росах зіхаціць,
Дае жыццё зямля, як маці, ўсім,
Хто нараджаецца, каб свет здзівіць.

**Санет**

Калі бываю я далёка ад радзімы,
Вяртаюся не раз у думках, снах
Да родных рэк і пушчаў гаварлівых,
Што душу мне сагрэюць па начах.

І калі мора будзе прада мною
І хвалі набягаюць да мяне,
Як толькі вочы закрываю, чую
І бачу родную рачулку ўва сне.

Прыгожыя мясціны вабяць нас,
А ў сэрцы ажывае без украс
Куточак родны, рэчка, поле.

Я зноў спяшаюся дамоў.
Тут, ведаю, мяне чакаюць зноў.
Свая зямля не здрадзіць нам ніколі.

**Санет**

Твой вобраз – у кожнай хаце,
Ў вачах – пяшчота і страх.
Мадонна, Боская маці,
Трымае дзіця на руках.

Такая ў яе воля лёсу:
Каб быў на зямлі спакой,
Яна сыходзіць з нябёсаў
Для сынавай долі людзкой.

Над полем гурганы кружаць,
Слязамі гора не здужаць.
Ты веру ў душы не згубі.
Зноў плача маці па салдату,
Які не вернецца ўжо ў хату.
І чуцен голас з неба: “Не забі!”

